

магілёўскі

Выбар

№ 17
Кастрычнік
2012 г.

Абласная Дэмакратычная Трыбуна

ЯК БЕЛАРУСАЎ “У ЛАПЦІ АБУЛІ”

Савецкая ўлада выканала галоўную функцыю за час свайго кіраваня: яна стварыла такога чалавека, які ёй быў патрэбны. Так званага чалавека новай фармацыі. І зараз неакамуністы на гарбу гэтага чалавека едуць у рай. Гэта значыць, выкарыстаўваюць яго па поўнай праграме ў сваіх карысных мэтах. Калі дакладней – б’юць і плакаць не даюць.



Мяркую, чытач разумее, што я не Амерыку на адкрыў. Проста канстатую факты…

Нядаўна сустракаю суседа. Раней рабіў у ПМК-99. Кажу яму, што, маўляў, даўненька яго ня бачна. Адказвае, што працуе зараз у Расеі. Тут жа няма чаго рабіць. “Ну і як там?” – пытаюся ў яго. “Цяжкавата ад дому”, - адказвае. “Ну, кажу яму, - ласуйцеся тым, што зарабілі. Мы на кожным перакрыжаванні крычалі, што за Лукашэнку галасаваць нельга. А вы з нас, БНФаўцаў, смяяліся. Не хацелі нават і слухаць нашы довады, меркаванні”. “Так, было такое, неразумныя былі”, - адказвае.

Так. Зараз увесь час думаю-гадаю, як кучка маладых “ваўкоў” начале з Лукашэнкам змагла абдурыць 10-мільённы народ Беларусі…

Гляджу запіс 1994 году - сустрэча Зянона Пазняка і яго каманды з выбаршчыкамі ў прамым эфіры па тэлебачанні. У камандзе такія волаты, як Васіль

(Заканчэнне на стар. 2)

ЯК З АБЯЦАНЫХ 1000 ДОЛАРАЎ АТРЫМЛІВАЮЦЦА “ССОХЛЫЯ” $684

Палітычнае “свята” (выбары ў палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу) скончылася, і пачаліся суворыя эканамічныя будні.

Настрой псуецца хутка

Па-першае, амаль адразу пайшлі ў рост цэны, якія ўлады прытрымлівалі, каб не псаваць настрой грамадзянам перад паходам на выбарчы ўчастак. З 3 кастрычніка падаражэў бензін і праезд у грамадскім транспарце ў Менску.

Па-другое, пачала пакрысе таннець нацыянальная валюта. На пачатку кастрычніка долар пераадолеў псіхалагічную мяжу ў 8500 беларускіх рублёў, а еўра штурмуе 11000.

Цікава, што будзе рабіць кіраўніцтва Беларусі ў 2013 годзе, на які прыпадае пік плацяжоў па знешніх крэдытах. Ужо зараз сітуацыя ў эканоміцы выглядае надта неўстойлівай, а выплаты ў памеры некалькіх мільярдаў долараў здольныя канчаткова яе расхістаць.

Па-трэцяе, канчаткова высвятлілася, што неверагодныя поспехі беларускай эканомікі ў 2012 годзе грунтуюцца на кантрабандзе нафтапрадуктаў пад выглядам “распушчальнікаў” ды “разбаўляльнікаў”. Эксперты казалі пра гэта і раней, аднак улады ўпарта сцвярджалі, што нават без гэтых артыкулаў прыбытку знешнегандлёвае сальда застанецца станоўчым. Аднак, як толькі ў жніўні гэты бізнес ляснуў, імпарт адразу перавысіў экспарт на 386 мільёнаў долараў.

(Заканчэнне на стар. 3)

ЯК БЕЛАРУСАЎ "У ЛАПЦІ АБУЛІ"

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Быкаў – знакаміты пісьменнік, Анатоль Станкевіч – кандыдат эканамічных навук, Радзім Гарэцкі – акадэмік, Іван Нікічанка – доктар сельскагаспадарчых навук (зараз нябожчык), Юрась Беленькі – эканаміст (па-мойму, таксама кандыдат эканамічных навук), Юры Хадыка – прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, Уладзімер Заблоцкі – адзін з распрацоўшчыкаў касмічных сістэм, і шмат іншых навукоўцаў - інтэлігентных, разумных, адукаваных прафесіяналаў, меўшых жыццёвы вопыт людзей.

Хто ж ўваходзіў у каманду А.Лукашэнкі? Іван Ціцянкоў – першы сакратар Краснапольскага райкаму партыі, які пасля абрання А.Лукашэнкі прэзідэнтам на вачах у беларусаў разадраў на шматкі сімвал нашай краіны – бел-чырвона-белы сцяг. Уладзімір Шэйман – "афганец" (кіраваў клубам у Афганістане), Аляксандр Фядута – галоўны камсамолец Беларусі, Уладзімер Канаплёў – міліцыянт (пасялковы ўчастковы), Леанід Сініцын, Дзмітрый Булахаў, Віктар Кучынскі, які даказваў сваю адданасць прэзідэнту тым, што гатоў быў яго абараняць з гранатамётам у руках (толькі невядома, ад каго ён збіраўся яго абараняць). Вам, паважаныя чытачы, гэтыя прзвішчы аб чым-нібудзь кажуць? Ці, можа, казалі ў1994 годзе? Мне – абсалютна не! Незразумела толькі, як у гэты натоўп папаў інтэлігентны, адукаваны Віктар Ганчар – кандыдат юрыдычных навук ды Анатоль Лябедзька – юрыст? Хаця, калі крыху пашавяліць мазгамі, то тут, па-мойму, усё становіцца на свае месцы. І сакрэту вялікага няма: яны ж таксама былі камуністамі, а таму зліліся ў адну кучку, толькі кожны са сваімі меркантыльнымі меркаваннямі. Менавіта, В. Ганчар, А. Фядута ды Дзмітрый Булахаў зрабілі найвялікшы ўклад у тое, каб дырэктар саўгасу стаў кіраўніком краіны.

І тое, што А.Лукашэнка стаў прэзідэнтам дзякуючы таму, што на яго працавала ўся дзяржаўная інфармацыйная машына (і як потым прызнаўся сам Лукашэнка – і значная частка КДБ) – гэта зразумела. Але ж і народ быў як у шалёным угары ад любові да Аляксандра Рыгоравіча. Гэта было відавочна і замінаць гэты факт немагчыма. Ёсць людзі, якія і зараз яшчэ слепа вераць кіраўніку Беларусі…

Мяркую, што тут галоўным фактарам выступаў і выступае той "тэзіс", які бальшавікі загналі ў галовы людзям "новай фармацыі": хай лепш мая карова здохне, але і ў суседа каб не было ніводнай. Менавіта на такой струнцы і сыграў старшыня антыкарупцыйнай камісіі А Лукашэнка. Я памятаю, як пасля дакладу па тэлескрыні аб "полных чемоданах" кампраматy супраць В. Кебіча, народ, літаральна захлёбваючыся, трыумфаваў ад радасці, што ўрэшце рэшт знайшоўся чалавек, які"растрыбушыў" нянавіснага Вячаслава і запрэ яго за краты. Але прэзідэнта абралі, пар выпусцілі ў свісток, а В.Кебіч і зараз "живёт и здравствует" назло сваім ворагам (гэта значыць народу Беларусі).

Ці магла незалежная Беларусь стаць прававой і эканамічна развітай краінай пры цяперашнім прэзідэнце? Даю магчымасць чытачу пакумекаць самастойна. Я толькі зраблю невялікую "наводку". Доўгі час генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь быў Віктар Шэйман. Танкіст!!! Не маючы аніякай юрыдычнай адукацыі. Гэта ўжо пасля, займаючы пост генеральнага, скончыў Акадэмію пры прэзідэнце. Нацыянальны банк Беларусі 13 год узначальваў інжынер-будаўнік Пётр Пракаповіч (зараз ён кансультант пры Прэзідэнце). І гэтак далей. Адукаваныя людзі, спецыялісты сваёй справы, накшталт прафесара Станіслава Багданкевіча, ў кіраўніцтве не патрэбны. Ну, а калі пірагі пачынае печ шавец, а боты шыць піражнік, то самі ведаеце, што з гэтага атрымліваецца.



Так што, паважаныя суайчыннікі, ляцець нам уніз, пакуль шлёпнемся аб дно, яшчэ доўга. І як сказаў малады яшчэ прэзідэнт, беларусы будуць жыць дрэнна, але нядоўга. Так яно і адбываецца. Кожны год наша краіна страчвае такі горад, як Чэрыкаў і крыху больш. Былі і болей сумныя гады, калі рэспубліка за год хавала такі населеныя пункты, як Крычаў.

Адбыліся выбары ў Палатку. Гэта, безумоўна, ня выбары прэзідэнта. Але, калі б народ пасапраўднаму мог абраць сваіх прадстаўнікоў у заканадаўчы орган, сітуацыя магла пераламіцца ў іншы, лепшы для людзей, а значыць і для ўсё краіны, бок. Але справа выглядае так, што ўлада пастаянна трымае людзей за лохаў, а выбары пераўтварыла ў лахатрон. Электарат пакуль прымае гэткія правілы гульні, ён у чарговы раз пайшоў на гэтыя псеўдавыбары. Толькі трэба яму (народу) думаць, што ён атрымае пасля. Хутчэй за ўсё, прыйдзецца электарату, а разам з ім і ўсяму народу Беларусі насіць тыя самыя "лапці", у якія яго "абулі" ў 1994 годзе.

Сямён Панізоўцаў

ЯК З АБЯЦАНЫХ 1000 ДОЛАРАЎ АТРЫМЛІВАЮЦЦА "ССОХЛЫЯ" $684

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Дайшло яшчэ не да ўсіх

Становішча можа істотна пагоршыцца ў чацвёртым квартале, бо Расія скараціла пастаўкі нафты на беларускія НПЗ. Праз гэта паменшацца прыбыткі ад экспарту бензіну ды дызельнага паліва, можа ізноў узнікнуць дэфіцыт валюты з усімі наступствамі, якія з гэтага вынікаюць.

Праўда, новыя рэаліі дайшлі яшчэ не да ўсіх. Старшыня Савету рэспублікі Анатоль Рубінаў заявіў: "Главное — не сбавлять темпов с тем, чтобы наиболее успешно завершить начатое, довести к концу года до логического завершения каждую позицию наших планов. В следующем году экономика должна будет выйти на такую траекторию развития, которая позволит в полном объеме выполнить планы всей пятилетки в целом".

Аптымізмам ззяе і кіраўнік краіны. Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў прагноз па асноўных эканамічных паказчыках на 2013 год: рост валавага ўнутранага прадукту на 8,5%, рост экспарту – 15%, знешнегандлёвае сальда – станоўчае, 0,7% ад ВУП і г.д.

Аднак "планы всей пятилетки в целом" чамусьці скасоўваюцца датычна сярэдняга заробку. На Ўсебеларускім народным сходзе Лукашэнка абяцаў 1000 даляраў да канца 2015 г., а цяпер цішком гэтая лічба ссохла да 684.

Ды й "довести к концу года до логического завершения каждую позицию наших планов" не атрымаецца. Праваленыя такія накірункі, як замежныя інвестыцыі, энергаашчаднасць, і нават валавы ўнутраны прадукт пачаў імкліва губляць тэмпы росту.

Скасоўваюцца нават надбаўкі на "гародніну"

Таму ўлады хуценька пачалі шукаць, дзе можна зэканоміць. І вось ужо Лукашэнка анансуе:



"Я долго колебался, но принял для себя решение – 25-30% кадров в госорганах мы сократим. Они нам просто не нужны".

Але гэта справа не хуткая. А фінансы, падобна, спяваюць рамансы ўжо зараз. Чым інакш патлумачыць тое, што сёлета пенсіянераў пакінулі без адмысловай надбаўкі «на гародніну»?

Цікава, што будзе рабіць кіраўніцтва Беларусі ў 2013 годзе, на які прыпадае пік плацяжоў па знешніх крэдытах. Ужо зараз сітуацыя ў эканоміцы выглядае надта неўстойлівай, а выплаты ў памеры некалькіх мільярдаў долараў здольныя канчаткова яе расхістаць.

Нават міністэрства фінансаў ужо не спадзяецца ўтрымаць нацыянальную валюту на цяперашнім узроўні. У праект бюджэту-2013 закладзены сярэднегадавы курс на ўзроўні 8950 рублёў за 1 долар.

Выглядае, што Беларусь чакае чарговы "складаны перыяд". Зрэшты, гэтыя "часовыя цяжкасці" доўжацца ўжо больш за 18 год, і канца ім не бачна...

Валянцін СЫЧ

ЛІТОЎСКІ ТЭЛЕКАНАЛ: БЕЛАРУСКІЯ АЛІГАРХІ НАБЫВАЮЦЬ КВАТЭРЫ І ДАМЫ Ў ВІЛЬНІ

TV3, агучваючы гэтую інфармацыю, спасылаецца на свае крыніцы.

Між іншым, тэлеканал адзначае, што бліжэйшае атачэнне Аляксандра Лукашэнкі і буйныя алігархі кантактуюць з літоўскімі палітыкамі і прадпрымальнікамі, і ўжо даўно фармуюць іх погляд на сітуацыю ў Беларусі.

Паведамляецца, што нерухомасцю ў Вільні, нібыта, валодаюць алігарх Аляксандр Шакуцін, уладальнік кампаніі "Трайпл" Юрый Чыж, амбасадар Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын, былы міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў і нават прэм'ер-міністр



Міхаіл Мясніковіч. Як інфармуе БелаПАН, у прэс-службе Савета міністраў нашай краіны адмовіліся ад каментароў.

меркаванне

«УПАСТЬ И НЕ ВСТАТЬ !?»

Открытое письмо ко всем кто не разучился думать, кому не безразлична судьба страны.

Уже месяц назад мы, в очередной раз, продули режиму выборы, «что само по себе и не ново…».

Наверное, было бы неправильным публично анализировать причинно-следственные связи очередного провала, в связи с тем, что предательство в рядах оппозиции стало обыденным явлением.

Предательство и прямое, и косвенное (которое заключается в паразитировании части «командиров и бойцов» на идеи освобождения страны от антинародного режима).

Но вот о видимой всеми стороне говорить надо обязательно. И публично. О том, что часть наших «лидеров», оказавшихся волей судьбы, а не благодаря личностным качествам, в этой роли не оправдали и в малой степени надежд на них возлагаемых. А это уже публичный обман.

Не располагая стратегическим мышлением, они увлеклись обменом тактическими уколами с режимом. Эти «уколы» заключались в констатации фактов (всем и так давно известных, таких, как очередное нарушение прав человека, ухудшение жизненного уровня, тупость чиновничества и т.п., ничего практически не предлагая взамен) в малотиражных изданиях печатных, к ним же можно отнести и интернет издания, – за внешней стороной популярности которых скрыта довольно жидкая и не постоянная среда посетителей-«обывателей».

В то же время ПОСТОЯННО, своими тупейшими лозунгами, отпугивали своих потенциальных сторонников.

Вместо детального анализа полного провала «промышленной революции» в стране, которая и заканчивается-то распро-



дажей обломков промышленного комплекса зарубежным инвесторам без участия НАРОДА.

Вместо детального анализа ситуации в сельском хозяйстве, очередной авантюры режима по созданию гигантских агро-как бы промышленных комплексов, т.е. гигантских колхозов, еще не виданных человечеством по своим масштабам, которое неизбежно ведет к окончательному уничтожению человека земли, кормильца – крестьянина, сегодня загнанного в бараки агрогородков, концлагерного типа. И это, пожалуй, еще большая по своим последствиям катастрофа, так как она заканчивается окончательной потерей продовольственной безопасности страны.

Мы не слышим набата по поводу гибели белорусских лесов и болот, загаживания рек!!! А это ведет к катастрофическим экологическим последствиям. В стране, где и так как min 30% территорий не пригодны на сегодняшний день для жизнедеятельности человека. Но режим с упорством, достойным лучшего применения, продолжает сельхозработы на этих территориях, нанося непоправимый вред человеку. Продолжаются на территории страны работы по созданию генномодифицированных продуктов – заразы страшнее СПИДа. Медицина отечественная молчит, т.к. лишь частично может называться современной, ее уровень неизбежно оказался на уровне африканских стран. Режим сократил население страны как min на МИЛЛИОН сограждан. Где ваш детализированный анализ ситуации?

Режим наконец-то добрался (и это закономерно), до образования, в том числе и высшего. Научно-технический потенциал любой страны оценивается по наличию и уровню научных кадров, уровню образования населения. Один, отдельно взятый человек, может определять дальнейшую судьбу научного потенциала всей страны на десятилетия вперед. Сокращение учебных программ, сокращение высших и средних специальных учебных заведений ведет к высвобождению преподавательских кадров (которые формировались десятилетиями), их размыванию, уничтожению. Но в стране маниакально, тупо увлеченной строительством одной огромной животноводческой фермы на базе

(Начало. Оконч. на стр. 5)

«УПАСТЬ И НЕ ВСТАТЬ !?»

(Оконч. Начало на стр. 4)

всей страны, не нужны умные люди… Нужны полупромышленные, не умеющие думать рабы, лишенные земли (чтобы не отрывались от работы во благо барина…) закрытые в агрогородки. Таким образом, через 150 лет после отмены крепостного права, оно уверенно возвращается в центре Европы! У нас! Где ваш анализ ситуации?

Подавляющее большинство юношей-призывников идут на службу в органы МВД, где неизбежно травмируется неокрепшая психика, рождая нам целое поколение мужчин-тюремщиков. В МВД должны проходить службу уже сложившиеся граждане, люди с крепкой психикой и только на контрактной основе. Вы об этом задумывались?

Нет у вас ни хрена!!!! Нет и анализа, нет и своих, проработанных, детализированных предложений по спасению страны. Все в общем, «в мировом масштабе». Вот придем к власти!!!! Ну, пришли! А дальше??? Уже вчера вы должны были откровенно рассказать о том, что ждет страну, когда вы придете к власти. Не врать о светлом и безоблачном будущем, а конкретные по времени действия… Тогда-то вас и зауважают, а пока о каждом из вас: «А чем он лучше других!?»

И вот тут-то закономерно, что такой «инертный», «тупой» народ не хочет идти за нами, т.к. они просто не видят то, ради чего стоит ИДТИ!

Народ видит, что вы не в состоянии, даже ради стратегических целей, на объединение своих усилий. У народа это и называется – «у каждого Абрама своя программа» или «политические игрища», в которых ему недосуг принимать участие, т.к. надо кормить семьи, выживать... От выборов было НЕОБХОДИМО отказаться в момент формирования избирательных комиссий – когда нас к ним не подпустили и на пушечный выстрел. А тупое – «…вот как мы Луке насолили, за несколько дней до выборов сняли свои кандидатуры –пусть перепечатывает бюллетени»- это что, уровень партийных лидеров???

Вместо детального анализа ситуации. Вместо своих проработанных предложений по спасению отечественной промышленности, сельского хозяйства, а другими словами ВСЕЙ СТРАНЫ, вы, господа, откровенно уводите народ от решения насущных проблем, а зачастую и к вопросам оголтелого национализма, к разделению граждан по языковому принципу. Прекратите раскалывать страну на своих и чужих. Что в свою очередь значительно сокращает ряды наших сторонников, ряды противников режима, от которого все сильнее тянет полуфашистским душком (физическое уничтожение политических противников, политзаключенные, политэмигранты, уничижительное отношения к памяти павших в годы ВОВ, полное игнорирование Конституционных прав и свобод граждан и т.п.). Так на кого вы работаете? И о каком своем политическом будущем вы мечтаете???

Идет новое поколение солдат демократии, в рядах которых места нам не будет. Если вы этого не видите, то вы еще и политические слепцы.

И еще один важный момент: Один из самых главных «инструментов» в работе с людьми это: ДОСТУПНОСТЬ!!! Тем паче, с соратниками! А многие из вас (сдуру что ли?) построили лукашистские вертикали! Когда вы в последний раз (первый???) позвонили «в глубинку» где у вас варятся в собственном соку всего несколько, а иногда всего один сторонник??? А есть ли у вас хотя бы карты страны с нанесенными на нее обозначениями где, сколько, в каком регионе ваших сторонников???

Михаил Кучеренко

АБРАМАВА: КІРАЎНІЦТВА КРАІНЫ ЗАЎСЁДЫ ВЕДАЕ РЭАЛЬНЫЯ ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ

Пра гэта Рацыі заявіла былы дэпутат парламента Вольга Абрамава, якая некалькі дзён таму распавяла журналістам пра механізмы фальсіфікацыі выбараў. "Усе галасы падлічваюцца, і рэальны вынік паведамляецца наверх", – упэўнена Вольга Абрамава.

Па яе словах, маючы рэальныя лічбы на руках, улада карэктуе унутрыпалітычны курс краіны.

- На самай справе гэтыя дадзеныя прызначаныя для вушэй улады, для прыняцця рашэння, для карэкцыі курса, калі вызначаецца вялікая колькасць людзей актыўна незадаволеных. І гэтак кола пашыраецца і пашыраецца істотна, і я думаю, што на гэтых выбарах так і будзе, таму што эканамічным становішчам людзі не задаволены ў



дастаткова высокай ступені. Тады ўлада павінна шукаць варыянты змены сваіх паводзін.

Па словах Вольгі Абрамавай, калі раней улады фальсіфікавалі вынікі выбараў пры дапамозе ўкідвання бюлютэней, то зараз яны проста перапісваюць выніковыя пратаколы. Сведкам падобнага механізму падтасоўкі выбараў была дэпутат Палаты Прадстаўнікоў стала падчас парламенцкай кампаніі 2008 года.

Аляксандр Ярашэвіч, Радыё Рацыя

ШТРАФУЮЩЕЕ ПРАВОСУДИЕ

Этим летом я и мой знакомый ехали по делам в Кричев. Нужно было успеть к определённому времени, так что водитель нажимал на газ. На повороте к Барсукам он ещё больше прибавил скорость и только после этого заметил, что впереди расположился пост ГАИ. Они-то, разумеется, заметили нас раньше и уже сигнализировали, чтобы мы остановились. Факт нарушения был налицо, так как скорость была реально превышена. Гаишник выписал штраф в две базовых, взял деньги и, отдавая квитанцию об уплате, почему-то пояснил: «Не переживай, мне сегодня надо ещё семь протоколов составить...».

Существуют ли в Беларуси планы по штрафам? Эта тема, на первый взгляд, безосновательно муссируется уже много лет, но с другой стороны, нельзя отрицать, что для этого есть самые веские основания. И дело вовсе не в слухах и предположениях, а в том, что фактов, свидетельствующих о подобном «планировании», накопилось более чем предостаточно.

Например, экономист Ярослав Романчук обратил внимание, что если посмотреть на доходную часть республиканского бюджета, мы увидим, что там прописывается сумма штрафов, которую предполагается собрать в течение года. Так, бюджет на 2011 год предполагал поступления от штрафов в размере 32,2 млрд. рублей. Фактически, по выражению Романчука, это «бюджетное планирование штрафов».

Конечно, никакого секрета здесь нет, общеизвестно, что поступления от штрафов весьма ощутимо пополняют государственную казну. Секрет лишь в том, каким образом добиваются этих поступлений. Власти категорически отрицают доведение планов по штрафам непосредственным исполнителям в контролирующих и правоохранительных органах. Но, как говорится, дыма без огня не бывает. Сейчас неудобные вопросы начинают задавать даже те, от кого власти не ожидают их услышать. Летом 2010 года депутат парламента Александр Шатько пытался узнать у министра финансов Харковца, зачем в доходной части бюджета отдельной строкой идёт «Штрафы, удержания». Министр заверил депутата, что ни одному ведомству не доводится план по взысканию штрафов. Но поскольку штрафные санкции применяются, их целесообразно заранее учитывать в бюджете.



Всё вроде бы логично. Штрафы не планируют — их учитывают. Почему же тогда применение штрафных санкций может существенно превысить их запланированный учёт, то есть изначально планируемую сумму? Не потому ли, и это все прекрасно понимают, что лучше перевыполнить, чем недовыполнить зафиксированные в бюджете цифры? Не зря же министр финансов озвучил в парламенте, что в 2009 году от взыскания штрафов ожидалось получить 28 млрд. руб., а по итогам года вышло 30 млрд. Единственное, на наш взгляд, объяснение этому заключается в том, что милиция и КГК усиленно и всемерно помогали наполнять государственные закрома.

Напоследок ещё один пример из местных реалий. Он также подтверждает, что вывод о нацеливании органов на рост штрафоприменения, основывается на конкретных фактических основаниях. Так, в Климовичском районе уже несколько лет прослеживается всё более растущая тенденция по привлечению граждан к административной ответственности за распитие спиртных напитков в общественных местах. Согласно официальным данным, в 2008 году по этой статье было привлечено 554 человека, в 2009 — 780 чел., в 2010 — 903 чел., в 2011 — 1108 чел. Остаётся предположить, что в Климовичах либо полным ходом прогрессирует алкоголизация населения либо районная милиция действительно исходит из того, что отчётность по штрафам лучше перевыполнить, чем недовыполнить.

Тимур Незванов

МАГІЛЁЎСКІ НАЗІРАЛЬНІК ЗА ВЫБАРАМІ ПРОСІЦЬ НАН ПРАВЕРЫЦЬ ТЭОРЫЮ ВЕРАГОДНАСЦІ



Аляксей Паўлоўскі

Адпаведны ліст былы назіральнік за выбарамі на ўчастку №53 Магілёўскай-Цэнтральнай выбарчай акругі №85 накіраваў у гэтую дзяржаўную ўстанову. Нагодай для звароту ў Акадэмію навук сталі вынікі галасавання, якія, паводле Паўлоўскага, цалкам ставяць пад сумнеў тэорыю верагоднасці.

"Я не першы раз назіраю за ходам выбараў на дадзеным участку. Гэтым разам склад камісіі быў цалкам абноўлены і таму камісія спрабавала выконваць працэдуру падліку галасоў выбаршчыкаў, - кажа Аляксей Паўлоўскі. - У адрозненні ад іншых выбарчых участкаў на маім участку на даму галасавалі ўсяго некалькі дзесяткаў чалавек. Пры ўскрыцці скрыняў для галасавання падлік бюлетэняў здзяйсняўся з кожнай скрыні паасобку, чаго не было на іншых участках".

Калі ж скрыня з датэрміновага галасавання была ўскрыта, то адтуль дасталі 880 бюлетэняў, 560 бюлетэняў дасталі з скрыні асноўнага дня галасавання.

"Натуральна, што 880 чалавек, альбо 60% выбаршчыкаў участка, прагаласаваць датэрмінова не маглі. Гэта было бачна па тым, як стосамі вывальваліся з скрыні бюлетэні. Калі ж пачалі весці падлік галасоў, то аказалася, што пры датэрміновым галасаванні за праўладнага кандыдата пракурора Эдуарда Сянкевіча прагаласавала 680 чалавек, 60 - за бліжэйшага канкурэнта спн.Кузьміну, а застаўшыяся 140 галасоў размеркаваліся паміж іншымі кандыдатамі і "супраць усіх, - прыводзіць свае падлікі Аляксей Паўлоўскі. - Калі ж падлічылі бюлетэні ў скрыні з асноўнага дня галасавання, то за Эдуарда Сянкевіча было 180 галасоў, а за Кузьміну - 150. У першай скрыні суадносіны галасоў за Кузьміну і Сянкевіча склалі 1:10, а ў другой - амаль 1:1".

Вось тут, па словах назіральніка, і ўзнікае казус тэорыі верагоднасці: як такое можа быць?

"Бо агульны настрой выбаршчыкаў, укінуўшых бюлетэнь у скрыню, звычайна сіметрычна адлюстроўваецца ў розных скрынях", - тлумачыць свае сумневы назіральнік. Каб атрымаць адказ на гэтае матэматычнае пытанне, Аляксей Паўлоўскі і звярнуўся да лепшых навукоўцаў Беларусі.

"Праваабаронцы за свабодныя выбары"

ЖИВУТ ЖЕ ЛЮДИ

Тема возникла не случайно. Мы решили сравнить условия жизни наших чиновников и людей, которым элементарные вещи, касающиеся жизненного комфорта, пока только снятся. Речь идет о конкретной социальной сироте, которую шкловские бюрократы от системы образования загнали в такой «тупой» угол, из которого можно выйти только через «замуж».

Так удачно получилось, что многострадальная сирота: сначала от мамы-алкоголички, потом от постоянного переезда из приюта в приют, потом от груза ответственности от создавшейся ситуации (симпатичной девушке в 17 лет очень сложно гордиться статусом сироты) после окончания школы поступила в один из могилевских ВУЗов. Радоваться нужно этому событию, но только не социальной сироте, родившейся в Шкловском районе. Собственно, на радость в жизни налетела туча квартирных неприятностей. Чего проще – исполняй чиновник закон (от 21 декабря 2005 г. № 73-З «О гарантиях по социальной защите детей-сирот, детей, оставшихся без попечения родителей, а также лиц из числа детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей») и всем будет счастье. А Закон гласит, что детям-сиротам, детям, оставшимся без попечения родителей, а также лицам из числа детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей, гарантируется сохранение права собственности на жилое помещение или права пользования жилым помещением, из которого они выбыли. Так вот, чтобы первокурснице приписаться в общежитии, нужна прописка (или регистрация по-новому) с последнего места жительства. Но жить практически негде, так как родительский дом стоит бесхозным, как и вся жизнь мамы, и непригодным для жилья. Работники Шкловского райисполкома и соответствующего сельсовета приписали-таки сироту в этом доме. Хотя при одном взгляде на дом видно, что делать этого нельзя было. Фокус ведь в том, что после окончания ВУЗа сироту в этот дом и выпишут из общежития. А где жить?

(Начало. Оконч. на стр. 8)

ЖИВУТ ЖЕ ЛЮДИ

(Оконч. Начало на стр. 7)



Есть в Законе положение: если указанные лица не могут быть вселены в жилое помещение, из которого выбыли, и невозможность вселения в такое жилое помещение установлена местным исполнительным и распорядительным органом по месту нахождения данного жилого помещения или если при вселении в жилое помещение, из которого выбыли, они стали бы нуждающимися в улучшении жилищных условий, по желанию этих лиц им предоставляется жилое помещение социального пользования государственного жилищного фонда в сроки и порядке, установленные законодательными актами. Но сироту сразу предупредили, что жилья нет и не ожидается и самый лучший вариант для нее – за оставшиеся годы обучения хоть как выйти замуж.

Александр Стекловский

В БЕЛАРУСИ ПОЧТИ НА ТРЕТЬ СОКРАТЯТ ЧИНОВНИКОВ

1 октября президент Беларуси заявил, что вслед за Министерством внутренних дел реформа коснется и других органов власти.

Александр Лукашенко сообщил, что им поручено создать специальную государственную комиссию, которая этим займется. Ее возглавят руководитель Администрации президента Андрей Кобякова и помощник президента Наталья Петкевич.

Лукашенко очертил суть реформирования: «Придется прилично подсократиться в государственных структурах». И назвал примерную цифру – 25-30%.

«Внизу меньше, вверху побольше, убрав ненужные функции и значительно потом увеличив денежное довольствие и заработную плату госслужащих», - дал установку Александр Лукашенко.

“Мы”

ДОРОЖАЕТ ВСЁ

С 4 октября в Беларуси увеличились предельные максимальные отпускные цены на свинину и говядину потушную.

Увеличены максимальные отпускные цены на свинину потушную — до уровня действующей в настоящее время отпускной цены на крупнокусковой мясокостный полуфабрикат в виде отрубов из свинины, а также на говядину потушную — на 30%.

Как поясняют в Министерстве экономики, постановление принято с учетом убыточности производства и реализации потушного мяса в целях своевременной закладки его в стабилизационный фонд Минска для организации бесперебойного обеспечения объектов общественного питания закрытой сети. Это производственные предприятия, лечебно-оздоровительные и учебные заведения.

Мясоперерабатывающим организациями предоставлена возможность повышения отпускных цен на эту продукцию, не превышая установленных предельных максимальных отпускных цен.

Между тем в опубликованном 28 сентября отчёте Национального статистического комитета Беларуси говорится, что республика «держит» абсолютное лидерство среди 19 стран Евразии по росту индексов потребительских цен.

В августе 2012 года Беларусь снова лидировала по росту потребительских цен: 1,8% республика прибавила в июне, 1,3% — в июле, 2,3% — в августе.

С декабря 2011 года по август 2012 года рост потребительских цен в Беларуси составил 14,6%.

С декабря 2011 года по август 2012 года рост цен на продукты питания и безалкогольные напитки в Беларуси составил 9,6% — самый высокий показатель среди 19 стран.

С 3 октября в Беларуси подорожали бензины и дизтопливо, проезд в общественном транспорте. С начала месяца в республике подорожали сигареты, до этого — коммунальные услуги и иные услуги, а также товары.

Соб. инф.

Анекдот дня

Очередное повышение цен на бензин связано с тем, что резко возросла стоимость перевозки бензина после последнего повышения цен на бензин.

– Как жизнь?
– Мухам бы понравилось.

магілёўскі **Выбар**

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі

Адрас рэдакцыі: Магілёўская воб, аг-к В. Машчаніца, вул. Савецкая, д.4. Тэл. 8 - 0259 204 308, e-mail: Boris152@gmail.com. Выдавец Міхайлаў Іван Барысавіч. Наклад: 299 асобнікаў, фармат А-4. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 09.10.2012 г. у 12-00.